Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
_____________С.Л. Шпарло
07.07 2023
Рэгістрацыйны № ВД-6-20-1эвуч.

# ГІСТОРЫЯ СВЯТ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 6-05-0215-04 Рэжысура прадстаўленняў і свят*

2023

Вучэбная праграма складзена на падставе вучэбных планаў па спецыяльнасці 6-05-0215-04 Рэжысура прадстаўленняў і свят

**СКЛАДАЛЬНІК**

*А. В. Катовіч*, кандыдат культуралогіі, дацэнт кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Т.Ф. Сухоцкая,* кандыдат культуралогіі, дацэнт, дацэнт кафедры культуралогіі установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

*А.Э. Салікаў,* кандыдат культуралогіі, дацэнт кафедры маладзёжнай палітыкі і сацыякультурных камунікацый Дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы»

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай рэжысуры* ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 10 ад 18.04.2023);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 6 ад 24.05.2023).

**СОГЛАСОВАНО**

Режиссер-постановщик

ГТЗУ «Молодежный театр эстрады»

________ И.А.Кривулько

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя свят» – адна са спецыяльных дысцыплін модуля «Традыцыйная і сучасная святочная культура Беларусі», выкладанне якой прадугледжана пры падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне сучаснай святочнай культуры.

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя свят» з'яўляецца базавай кампанентай у вывучэнні міфалагічных вытокаў рытуальна-абрадавай спадчыны і фарміраванні каляндарных сістэм розных народаў свету. Праграмай курса прадугледжана вывучэнне генезісу, структуры, сацыякультурных функцый міфа і рытуалу, месца фундаментальных катэгорый у фарміраванні этнакультурных карцін свету. Разгляд міфалагічных традыцый скіраваны на тыпалогію сістэм вярхоўных багоў і ніжэйшай дэманалогіі, іх цесную ўзаемасувязь з комплексамі каляндарных абрадавых практык. Важнай складовай курса з'яўляецца разгляд беларускай міфарытуальнай сістэмы ў кантэксце агульнасусветнай міфалагічнай традыцыі. Змест дысцыпліны пабудаваны ў логіцы непасрэднай сувязі з вывучэннем такіх спецыяльных дысцыплін, як «Традыцыйная святочная культура Беларусі», «Сучасная святочная культура Беларусі», «Сучасныя формы святочнай культуры», «Асновы мастацкага афармлення свят і відовішчаў», «Рэжысура фальклорных прадстаўленняў», «Рэжысура тэатралізаваных масавых прадстаўленняў і свят», «Музычна-шумавое вырашэнне свят» і інш.

Выкладанне дысцыпліны ва ўзаемасувязі з іншымі дазваляе ў поўнай меры сфарміраваць у студэнтаў спецыялізаваную кампетэнцыю: Ствараць сучасныя святы з улікам пераемнасці культурных і гістарычных традыцый Беларусі.

*Мэта* выкладання вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя свят»: раскрыць гісторыка-культурныя, міфасемантычныя і тыпалагічныя аспекты вывучэння рытуальна-абрадавых практык еўразійскіх народаў; на падставе структурна-семантычнага і зместава-сімвалічнага аналізу сфарміраваць ў студэнтаў неабходныя веды і кампетэнцыі ў галіне традыцыйных рытуальна-абрадавых практык, якія павінны спрыяць развіццю сучаснай святочнай культуры народа.

*Задачы вучэбнай дысцыпліны:*

– раскрыць асноўныя сістэмы паняццяў святочнай культуры, тыпалогію святочна-абрадавых комплексаў, звязаных з касмагоніяй і касмалогіяй у міфарытуальных традыцыях еўразійскіх народаў;

– раскрыць міфасемантычныя аспекты фарміравання рытуальна-абрадавых практык сакральнага календара ў еўразійскіх міфапаэтычных традыцыях;

– паказаць структурна-семантычныя і зместава-сімвалічныя асаблівасці рытуальна-абарадавых комплексаў навалецця ў этнакультурнай спадчыне еўразійскіх народаў; сфарміраваць веды аб асноўных этапах гісторыі развіцця абрадавай культуры і яе святочных формаў;

– навучыць сінтэзаваць каштоўнасці матэрыяльнай і нематэрыяльнай этнакультурнай спадчыны Беларусі, вызначаць шляхі і спосабы актуалізацыі традыцыйных святочна-абрадавых практык у сучасным сацыякультурным працэсе;

– выявіць асаблівасці эвалюцыі традыцыйных каляндарна-абрадавых практык еўразійскіх народаў у кантэксце сучасных працэсаў глабалізацыі.

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– гісторыю фарміравання каляндарных сістэм розных народаў свету;

– этапы развіцця свята як феномена сусветнай культуры, разнастайныя трактоўкі яго вызначэння і межы выкарыстання састаўных частак свята (міф, рытуал, абрад, культ);

– асаблівасці светапоглядных сістэм у розных традыцыйных культурах;

– універсальную структуру рытуальна-абрадавых комплексаў;

– асноўныя коды фарміравання святочна-абрадавых комплексаў;

– сэнсавую і каштоўнасную накіраванасць святочных формаўтварэнняў у культурах розных народаў свету;

– тэндэнцыі ў развіцці святочнай культуры Беларусі (прынцыпы арганізацыі пастановак святочных мерапрыемстваў, іх новыя формаўтварэнні);

*умець:*

– вылучаць адметныя рысы пэўнай гістарычнай эпохі і ўвасабляць іх у святочным дзеянні ў сучасных умовах;

– сістэматызаваць, параўноўваць і абагульняць веды пра рознапланавыя святочныя формаўтварэнні;

– распрацоўваць канцэптуальныя палажэнні аўтарскіх рэжысёрскіх праектаў на аснове ведаў па нематэрыяльнай культурнай спадчыне беларусаў;

– ажыццяўляць праекты фальклорна-этнаграфічнага вырашэння свят рознай тэматыкі, высокапрафесійна ўвасабляць ідэі абрадавых комплексаў на практыцы;

– выкарыстоўваць набытыя падчас вывучэння спецыяльнай дысцыпліны веды ў выкладчыцкай дзейнасці;

*валодаць:*

– метадамі і прыёмамі арганізацыі стварэння праектаў свят рознай тэматыкі з фальклорна-этнаграфічным вырашэннем;

– прынцыпамі пабудовы кампазіцыі, ведамі семантыкі і сімволікі галоўных персанажаў, атрыбутаў, рытуальных дзеянняў, адзення, слоў і іншых складовых частак свят рознай тэматыкі і розных гістарычных эпох;

– методыкай раскрыцця рытуальна-гульнёвай кампаненты традыцыйных абрадавых комплексаў.

На засваенне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя свят», дасягненне пастаўленай мэты і вырашэнне задач прадугледжана 108 гадзін, з іх аўдыторных – 68: лекцыі – 50, семінарскія заняткі – 18 гадзін. Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен. Працаемкасць вучэбнай дысцыпліны складае 3 заліковыя адзінкі.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Уводзіны

*Свята як частка культуры*

Прадмет, мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя свят» – адной са спецыяльных дысцыплін пры падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне святочнай культуры. Этымалогія феномена свята. Сувязь з паняццямі «відовішча», «рытуал», «абрад», «цырымонія». Іерафанія Сонца і Месяца. Уздзеянне міфаў, культаў, магіі, вераванняў, рэлігіі на фарміраванне свята, абраду, рытуалу і іншых урачыстых падзей. Класіфікацыя свят і абрадаў.

## Раздзел І. Гісторыя фарміравання беларускага народнага календара ў кантэксце традыцый сусветных календароў

*Тэма 1. Каляндар як складовая частка культуры. Месяцовы і сонечны календары. Параўнальны аналіз сусветных старажытных календароў*

Культуралагічнае паняцце «каляндар». Легенды аб стварэнні свету. Міфалагічная цыклічнасць часу. Біблейскія паданні аб часе стварэння свету. Лінейнасць у хрысціянскай канцэпцыі часу. Умоўнасць «кропкі адліку» часу. Эра ад стварэння свету. Хрысціянская эра: ад нараджэння Хрыста.

Салярная і месяцовая аснова ў гадавым колазвароце сельскагаспадарчых работ.

Уплыў іерафаніі Месяца і Сонца на фарміраванне сістэмы парадкавання часу. Змена фазаў Месяца як першааснова парадкавання часу. Адзінкі вымярэння часу на аснове цыклічнасці Месяца: тыдзень, месяц. Старажытныя месяцовыя календары: іўдзейскі, мусульманскі, рымскі. Асновы пабудовы старажытных месяцовых календароў шумераў і вавіланян.

Традыцыйныя ўяўленні аб асноўных пераходных момантах у задыякальным руху: дні зімовага і летняга сонцастаяння, веснавога і восеньскага раўнадзенства. Салярная цыклічнасць як аснова фарміравання каляндарных сістэм розных народаў. Паняцце «сонечны год». Адзінкі вымярэння часу на аснове сонечнай цыклічнасці: суткі і год. Старажытнаегіпецкі сонечны каляндар.

*Тэма 2. Шляхі фарміравання юліянскай сістэмы летазлічэння як прататыпа сучаснага календара*

Перадумовы рэформы старажытнарымскага календара. Гістарычная роля Гая Юлія Цэзара і грэчаскага астранома Сазігена Александрыйскага ў вызначэнні даўжыні сонечнага года. Паняцце «пачатак новага года». Дванаццацімесяцовы каляндарны год. Структурнае парадкаванне часу па

месяцах. Гісторыя фарміравання сістэмы каляндарных працягласцей. Пастаянная дата дня веснавога раўнадзенства. Высакосны дзень і высакосны год. Ушанаванне стваральніка новай сістэмы злічэння часу Юлія Цэзара і яго паслядоўніка рымскага імператара Аўгуста.

### *Тэма 3. Светапоглядныя асновы хрысціянства. Прынцыпы структуравання хрысціянскага календара. Свята Пасхі. Пасхалія. Уплыў праваслаўнай Пасхаліі на структуру беларускага народнага календара.*

Новая гісторыя існавання чалавецтва на зямлі, новыя крытэрыі засваення часу. Царква як сацыяльны інстытут распаўсюджання хрысціянскай традыцыі. Каталіцызм, праваслаўе, пратэстантызм.

Гісторыя фарміравання і структурная ўпарадкаванасць хрысціянскага календара: ушанаванне асноўных падзей з жыцця Ісуса Хрыста і Дзевы Марыі.

Гістарычная роля Нікейскага сабора (325 г.) у фарміраванні будучага сусветнага календара. Гістарычнае значэнне прынячце юліянскага календара. Увядзенне эры злічэння часу ад Раства Хрыстова. Асаблівасці святкавання іўдзейскай Пасхі. Сэнсава-семантычныя аспекты паняцця «пасха». Тайная вячэра, або апошняя Пасха, у жыцці Ісуса Хрыста. Распрацоўка правілаў вызначэння даты святкавання хрысціянскай Пасхі. Пасхалія, або час Хрыста. Асаблівасці структуравання хрысціянскай Пасхаліі – «календара ў календары».

Суаднесенасць веснавых свят беларускага народнага календара з пасхальным цыклам: рухомыя і нерухомыя святы.

### *Тэма 4. Дыялог культур: суіснаванне традыцыйнага народнага і хрысціянскага календароў у гістарычным кантэксце. Грыгарыянская рэформа хрысціянскага календара*

Прынячце хрысціянства ўсходнеславянскімі народамі. Складаны духоўныя, светапоглядныя, сацыякультурныя, прававыя і палітычныя аспекты працэса суіснавання дзвюх культур – народнай і хрысціянскай. Паняцце «двухвер'е», або «народнае праваслаўе». Уплыў феномена беларускай ментальнасці на зблiжэнне дзвюх каляндарных сістэм. Сэнсава-семантычная абумоўленасць узнікнення абрадавых комплексаў традыцыйнай культуры.

Касмізм юліянскага календара (неадпаведнасць юліянскага года трапічнаму, або сонечнаму, цыклу). Супярэчнасці суаднесенасці прыродна-касмічнага упарадкавання календара вызначэння даты святкавання хрысціянскай Пасхі як перадумова неабходнасці рэфармавання юліянскага календара. Гістарычная роля Папы Рымскага Грыгорыя XIII у рэфармаванні календара. Умовы каляндарнай рэформы.

Паступовае прынячце грыгарыянскай рэформы краінамі свету. Пратэст Рускай праваслаўнай царквы супраць грыгарыянскай рэформы. Перадумовы пераходу дзяржаўнага летазлічэння Савецкай Расіі на грыгарыянскі стыль.

## Раздзел II. Традыцыйныя рытуалы і святы ў сусветных культурах

*Тэма 1. Культы і святкаванні старажытных цывілізацый.*

Культы і святкаванні старажытных цывілізацый. Сезонныя перыяды працы і адпачынку ў абрадава-святочнай дзейнасці культур старажытнасці. Тыпалогія свят у Старажытным Егіпце. Значныя рэлігійныя рытуалы і святы фараонаў.

Міфалогія старажытных грэкаў як аснова абрадавых дзей. Галоўныя святы ў культуры Старажытнай Грэцыі: свята ў гонар збору ўраджая вінаграду «Дзіянісавы дзеі»; Афінскія, Панафінскія, Піфійскія і іншыя гульні. Відовішчы ў старажытнагрэчаскім амфітэатры. З'яўленне Алімпійскіх гульняў.

Галоўныя рытуалы ў культуры Старажытнага Рыма: атэлана, буфанада, сатурналія як састаўныя часткі свят Апалона, Плебейскіх і Рымскіх гульняў.

*Тэма 2. Гісторыя асноўных традыцыйных свят усходніх краін (Кітай, Японія).*

Дунчжыцзэ – свята ў гонар зімовага сонцастаяння ў Старажытным Кітаі. Новы год, або Свята вясны. Свята лодак-драконаў. Свята ліхатароў. Сімволіка галоўнай стравы свята. Сэнс навагодніх падарункаў. Цынмін («Свята чысціні і яснасці») – дзень памінання памерлых. Сучаснае ўвасабленне святочных кітайскіх традыцый.

Вызначэнне сэнсу жыцця праз святочную культуру Японіі. Танабата – свята ў гонар кахання і вернасці. Святкаванне Дня заснавання краіны – аднаго з галоўных свят. Хіган – свята пакланення продкам, якое адзначаецца штогод у дні вясновага і восеньскага раўнадзенства. Абон (Бон) – дні памінання, якія таксама называюць Святам ліхтароў.

*Тэма 3. Святочная культура Сярэдневякоўя, эпох Рэнесансу і Рэфармацыі*

Распад Рымскай імперыі, станаўленне феадалізму. Супрацьстаянне хрысціянства і язычніцтва. Хэлоўін. Карнавал. Гістрыёны, жанглёры, ваганты. Жанравая дыферэнцыяцыя іх творчасці. Ваганты і сучасная студэнцкая субкультура.

Паняцці «эпоха Рэнесансу», «эпоха Рэфармацыі». Жанры сярэдневяковых прадстаўленняў. Узнікненне містэрыяльнага тэатра. Драматургія містэрыі па трох асноўных частках Бібліі. Тэатр дэль артэ. Камедыя масак. Працэсія. Маскарад. Смехавая культура Рэнесансу.

## Раздзел III. Гісторыя фарміравання беларускай святочнай культуры

*Тэма 1. Космапланетарныя асновы структуры беларускага народнага календара*

Чатырохтактная мадэль структуры беларускага народнага календара як адлюстраванне прыродна-касмічнай цыклічнасці. Гісторыя фарміравання сістэмы свят і абрадаў народнага календара беларусаў. Семантыка і сімволіка міфа-рытуальных дзеянняў (акцыянальны код), нарматыўна-прававое поле абрадаў (стэрэатыпы паводзін, рэгламентацыі, табуіраванне, абмежаванні, прадпісанні). Атрыбутыўны код рытуальна-абрадавых практык. Яйка і зерне – універсальныя атрыбуты і сімвалы прыродна-касмічнай цыклічнасці. Часавая суаднесенасць галоўных свят традыцыйнага календара. Ушанаванне продкаў на пачатку і завяршэнні цыкла земляробчых работ.

*Тэма 2. Пантэон вярхоўных багоў як міфалагічная аснова структурнай упарадкаванасці традыцыйнага календара ("каляндарныя" багі)*

Супрацьстаянне Пяруна і Вялеса як касмаганічны саюз Неба і Зямлі ў каляндарнай абраднасці беларусаў: святы Грамніцы і Ўласce, "Ваджэнне і пахаванне Стралы", Ілля Грамавержац, "градавая серада – сухі чацвер".

Салярная аснова ў фарміраванні структуры календара. Бог Сонца Дажджбог і яго шматаблічнае ўвасабленне ў святах сакральнага календара: Ярыла, Купала. Зімовае і летняе сонцастаянні – святкаванне Калядаў і Купалля. Веснавое і восеньскае раўнадзенства – святкаванне Масленіцы, Вялікадня і Багача.

Святы веснавога адмыкання зямлі і яе нябесныя ахоўнікі: Ярыла – Юр'е; першы удар грому як прадвеснік адкрыцця хтанічнага свету. Восеньскае згортванне земляробчай падзейнасці: вобраз багіні ўрадлівасці Мокашы ў святах жніва; Узвіжанне – замыканне хтанічнага свету; Пакровы – рытуальная мяжа завяршэння земляробчых спраў.

*Тэма 3. Культ продкаў у сістэме каляндарных святкаванняў*

Тэма вяртання продкаў у сімволіцы абрадавых ахвярапрынашэнняў. Сімволіка першага ў абрадах ушанавання продкаў (першая лыжка куцці, абрадавае печыва "чырачкі", велікоднае яйка, першы сноп жыта). Калядная куцця – канцэпт каляндарнага памежжа.

Каляндарныя ўшанаванні продкаў: масленічныя пахаванні "бабы" і "дзеда", Масленічныя Дзяды, аўсяны кісель на Камаедзіцу; Наўскі Вялікдзень – чацвер Велікоднага тыдня, Траецкія Дзяды; палескі абрад "Ваджэнне Куста". Ушанаванне продкаў у земляробчай падзейнасці: Радаўніца – пачатак цыкла

земляробчых спраў, Восеньскія Дзяды – завяршэнне сельскагаспадарчых спраў.

Памінальныя дні на працягу года, “радзіцельскія” суботы.

*Тэма 4. Народная дэманалогія ў сістэме каляндарных святкаванняў*

Народныя прыкметы, звязаныя з распачынаннем перыяду стасункаў з прадстаўнікамі хтанічнага свету. Міфапаэтычныя асновы традыцыйных уяўленняў аб русалках. Русальны тыдзень – складаны комплекс ушанавання русалак. Дэманалогія беларускага Купалля. Нарматыўна-прававое поле паводзін у перыяд ад Купалля да Пятра.

Узвіжанне – каляндарная мяжа замыкання хтанічнага свету. Абрадавыя абмежаванні ў сістэме паводзін. Міфапаэтычны комплекс уяўленняў пра Цара вужоў, легенды і паданні пра вы-Рай. Сімволіка абрадавых дзеянняў на Юр’я (выпускае хтанічных істот) і Узвіжання (закрывае хтанічных істот).

*Тэма 5. Традыцыі навалецця ў міфарытуальных практыках беларусаў*

Каляндарная прымеркаванасць пачатку Новага года ў перыяд ад зімовага сонцастаяння да веснавога раўнадзенства. Характарыстыка часу ў міфалагічных вераваннях.

Рытуальна-абрадавы комплекс Калядаў – сімвалічная мяжа паміж старым і новым годам. Міфалагічныя аспекты касмізацыі хаосу. Гурт калядоўшчыкаў – сімвалічнае ўвасабленне пантэону вярхоўных багоў. Ваджэнне “казы” як ушанаванне бога Сонца. Калядныя кастры.

Матывы навалецця ў рытуальна-абрадавым комплексе Масленіцы. Выпяканне бліноў як увасабленне ідэі нараджэння Сонца. Сацыянарматыўныя аспекты масленічных абрадаў. Сацыяльная рэгуляцыя гендэрных аспектаў захавання роду: Абрад “Калодка”.

Камаедзіца: абрад “Разбудзіць мядзведзя” як зварот да татэмных першапродкаў аб распачынанні новага цыкла жыцця.

Вялікодны рытуальна-абрадавы комплекс у кантэксце традыцый сустрэчы Новага года. Валачобныя песні – сімвалічнае ўвасабленне сакральнага календара беларусаў. Нябесны пантэон у кантэксце гадавога цыкла земляробчага календара. Чырвонае яйка – сімвал згорнутага часу ў абрадах навалецця.

*Тэма 6. Ушанаванне першаэлементаў славянскай касмагоніі ў структуры народнага календара: апазіцыі “Неба – Зямля”, “вада – агонь”*

Міфалагічныя ўяўленні аб архетыпе зямлі. Дыхатамія “Неба – Зямля” ў касмаганічных уяўленнях беларусаў. Легенды і паданні аб ўтварэнні зямлі. Сімвалізацыя зямлі ў міфапаэтычнай спадчыне (Маці-сырая зямля, Маці-карміцелька). Сістэма этыкетна-нарматыўных рэгламентацый у дачыненні да зямлі.

Ушанаванне Зямлі ў каляндарных абрадавых практык. Масленічныя катанні з гор, абрады гукання вясны, Саракі; “асвячэнне” і рытуальнае ўключэнне сельскагаспадарчых прыладаў працы ў навалетні цыкл гаспадарання. Комплекс гаспадарчых і земляробчых рэгламентацый і забарон у прасторы святкавання Благавешчання. Комплекс міфалагічных уяўленняў, звязаных з веснавым адмыканнем зямлі на Юр’е. Першы веснавы гром. Імяніны зямлі ў маі. Ушанаванне зямлі ў рытуальна-абрадавым комплексе “Тройца – Зялёныя сяткі”. Сістэма гаспадарчых забаронаў, перасцярог, прадпісанняў на перыяд з Купалля і да дня ўшанавання Пятра і Паўла. Абрады заканчэння жніва: завіванне барады, падзяка і ахвяра Маці-зямлі.

Шматэтапнае восеньскае замыканне зямлі: аграрна-прадуцыравальныя аспекты свята Багач; міфалагічны комплекс уяўленняў свята Ўзвіжанне; Пакровы: сімвалізм завяршэння цыкла земляробчых работ; Восеньскія Дзяды – заключны этап замыкання зямлі на зімовы спачын.

Апазіцыя “вада – агонь” як процістаянне нябеснага і зямнога пачаткаў у касмаганічных міфах беларусаў. Стыхія вады як ўвасабленне хаосу, жаночага пачатку, асновы для ўтварэння зямлі. Уяўленні беларусаў аб міфалагічным статусе першага дажджу, першага снегу. Нарматыўна-прававое поле кантактаў чалавека са стыхіяй вады ў каляндарным колазвароце: хрышчэнская вада, “купанне ў Іардане”, купанне ў чысты чацвер, качанне па расе на Юр’е, забарона купацца на Русальным тыдні, у купальскую ноч, пасля Іллі Грамавержца.

Ушанаванне свяшчэннага агню: Грамнічная свяча як абярэг хатняй гаспадаркі ад перуновых стрэл у час навальніцы. Ушанаванне дрэў, у якія трапіла “перунова страла”. Сімвалізм першага веснавога грому. Святы агонь праваслаўнай Пасхі. Ушанаванне агню ў юраўскай абраднасці. Абрад “Ваджэнне стралы” – захавання вёскі і пасеваў ад засухі і пяруновых стрэл. Беларускае Купалле як сінтэз касмічных стыхій агню і вады. Купальскае вогнішча – сімвал росквіту Сонца.

Культ агню ў памінальнай абраднасці беларусаў. Палескі абрад “Жаніцьба коміна” як сімвал перанясення агню ў прастору сялянскага жылля.

*Тэма 7. Аброчная традыцыя ў сістэме каляндарных абрадаў беларусаў*

Міфасемантычныя і сацыянарматыўныя аспекты традыцыі абракання. Формы і структура абракальных абрадаў. Зместавыя аспекты абрадаў абракання: захаванне дабрабыту, калізіі сямейнага жыцця, лёс чалавека, удзел у вайне, самагубства каго-небудзь з членаў сям’і. Індывідуальныя, сямейныя, родавыя, агульнавясковыя абракальныя традыцыі; мужчынская і жаночая аброчныя традыцыі. Узаемасувязь традыцыі абракання з днямі ўшанавання хрысціянскіх святых. Рэгіянальныя асаблівасці абракальных абрадаў. Знітаванасць традыцыі абракання з локусамі сакральнай геаграфіі беларусаў: святыя крыніцы, свяшчэнныя дрэвы, камяні-крыжы і камяні-следавікі.

Царкоўны каляндар і сістэма аброчных традыцый: Варвараўская свяча ( “Гулянне ў свячу”); Мікольская братчына і аброчная свечка; абракальная

традыцыя на Ўшэсце, сувязь з абрадам "Ваджэнне і пахаванне Стралы ("Вынас свечкі"); Петрапаўлаўская аброчная традыцыя ("Брязгун"); Пакроўская свяча.

*Тэма 8. Беларускі карнавал: маскі і маскаванне, пераапрананне*

Беларускі карнавал у кантэксце еўрапейскіх містэрыяльных традыцый. Прасторава-часавы кантынуум беларускіх карнавалаў: абрадавае мадэляванне будучыні. Антысвет карнавальных відовішчаў. Сімволіка тэатралізаваных відовішчаў. Міфасемантычныя аспекты карнавальных традыцый. Пераапрананне як унікальная з'ява беларускай святочна-абрадавай культуры. Сімволіка-міфалагічная (салярная), магічная (карпаганічная, апатрапеічная), татэмістычная версіі паходжання карнавалаў. Галоўныя персанажы карнавальных відовішчаў: міфічныя багі, антрапаморфныя і зааморфныя постаці. Інверсійныя формы каляндарных відовішчаў: трансфармацыя мужчынскага і жаночага пачаткаў. Пераапрананне як спецыфічны тып гульні. Сімвалізм адзення і рэчаў. Эратычны свет народна-карнавалізаванай культуры.Карнавальныя пераапрананні і маскаванне. Карнавальныя маскі: тэхналогіі вырабу, працэсуальны кантынуум, рэчыўны свет. Карнавальны свет каляндарных абрадаў.

*Тэма 9. Гульня як абавязковая частка беларускай святочнай культуры*

Тэорыя Хёйзенгі аб станаўленні культуры на аснове гульні. Міфалагічная аснова святочных гульняў беларусаў. Класіфікацыя каляндарных, сямейна-родавых і пазаабрадавых гульняў. Гульні ў кантэксце каляндарных святкаванняў беларусаў. Эратычны аспект гульнёвых традыцый моладзі перадшлюбнага ўзросту. Абрадавыя гульні ў кантэксце вясельных абрадаў. Сацыялізацыя падлеткаў як спецыяльная тэма каляндарных святкаванняў.

Традыцыйныя зімовыя ігрышчы беларусаў: генезіс і тэндэнцыі развіцця зімовага гульнёвага комплексу. Калядныя гульні ў закрытым памяшканні. Тэатралізаваныя калядныя гульні ("Жаніцьба Цярэшкі", "Яшчар", "Жаніцьба Бахара"). Калядныя гульні на адчыненай прасторы ("Цягнуць каляду на дуба", "Кола", "Конікі", "Слуп", перацягванне канатаў).

Абрадавыя і пазаабрадавыя гульні веснавых свят народнага календара. Землеробчы-магічны накіраванасць абрадавых веснавых гульняў (качанне на арэлях, валачэнне калодкі, качанне яек, "біткі". Антрпаморфныя (баба, дзед) і зааморфныя персанажы абрадавых веснавых гульняў: птушкі, тур. "Тураўскі карагод" – юраўскае ігрышча моладзі. "Ваджэнне і пахаванне Стралы" – сакральна-магічны гульнёвы карагод на перасцярогу вёскі ад Перуна.

Гульнёвыя традыцыі беларускага Купалля. Варожбы на зяляніне, жытніх каласах. Шлюбная накіраванасць тэатралізаваных купальскіх гульняў. Гульнёва-песенныя спаборніцтвы рознаполых груп. Вогненныя ігрышчы (выбар пары, перакідванне вянкоў, варожбы з вянкамі, скокі праз вогнішча, качанне запаленага кола, шуканне папараць-кветкі). Карнавальныя купальскія

пераапрананні і начныя абходы вёскі: пераварочванне калёсаў, перанясенне лавак, раскідванне паляніц).

Гульнявыя элементы ў структуры восеньскіх святкаванняў. Карнавалізаваны карагод "Жніўны вянок". Жніўныя варожбы і вераванні моладзі перадшлюбнага ўзросту падчас свята дажынак. Гульні і варожбы шлюбнай накіраванасці свята Пакровы.

## Раздзел IV. Святочная культура: традыцыі і навацыі

### *Тэма 1. Дзяржаўныя святы і цырыманіялы. Прафесійныя святы. Гістарычныя і ваенныя святы*

Дзяржаўнае свята: гістарычнае або грамадска-палітычнае значэнне для краіны, станоўчы ўплыў на развіццё дзяржаўнасці, грамадства, краіны. Спіс дзяржаўных свят Рэспублікі Беларусь. Паняцце «цырыманіял». Шэраг дзеянняў (абрадаў, цырымоній) і прамоў сімвалічнага характару, традыцыйна абавязковых у грамадскім, палітычным жыцці краіны. Параўнальны аналіз цырыманіяльных мерапрыемстваў у дзяржавах свету ў розныя гістарычныя адрэзкі часу.

Прафесійнае свята – сацыякультурная інтэграцыя людзей адной прафесіі або сферы дзейнасці. Каляндар прафесійных свят Рэспублікі Беларусь.

Гістарычныя і ваенныя святы як працэс аднаўлення матэрыяльнай або духоўнай культуры пэўнай гістарычнай эпохі, творчы экскурс у гісторыю.

### *Тэма 2. Міжнародныя і рэспубліканскія фестывалі, рухі, акцыі*

Гісторыя Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў (Гавана, Масква). Фестываль музыкі ў г. Сопат (Польшча). Гісторыя ўзнікнення міжнароднага музычнага фестываля «Еўрабачанне». Дзіцячы міжнародны музычны фестываль «Еўрабачанне».

Станаўленне міжнародных і рэспубліканскіх фестываляў і конкурсаў ў Рэспубліцы Беларусь.

Новыя фарматы культурнага адпачынку гараджан. «Ноч музеяў» – сусветная акцыя, прымеркаваная да Міжнароднага дня музеяў. Начны агляд музейных экспазіцый. 15 жніўня – дзень бібліятэк у Беларусі. «Бібліяноч» – міжнародная сацыяльна-культурная акцыя, прысвечаная чытанню. Пашырэнне часу і фармату працы бібліятэк, кнігарань, літаратурных музеяў і арт-прасторы.

### *Тэма 3. Мастацка-спартыўныя відовішчы, спартакіяды. Алімпійскія, Паралімпійскія, Дэльфійскія гульні*

Гісторыя ўзнікнення і развіцця алімпійскага руху. Першыя спартыўныя гульні. Умовы, пераможцы, роля ўзнагарод. Старажытная Грэцыя, г. Спарта.

Паняцце “Алімп”. Спартакіяда. Алімпіяда. Паралімпіяда – міжнародныя спартыўныя спаборніцтвы для людзей з іваліднасцю.

Дэльфійскія гульні – спаборніцтвы (конкурсы, фестывалі), выставы і прэзентацыі ў розных галінах мастацтва. Вытокі сучасных Дэльфійскіх гульняў (антычных Піфійскія гульні, старажытнагрэчаскі г. Дэльфы).

Традыцыйныя цырымоніі адкрыцця і закрыцця мастацка-спартыўных відовішчаў.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | семінарскія заняткі | | | |
| **Уводзіны.** Свята як частка культуры | 2 | | | | |
| **Раздзел І. Гісторыя фарміравання беларускага народнага календара ў кантэксце традыцый сусветных календароў** | | | | | |
| *Тэма 1.* Каляндар як складовая частка культуры. Месяцовы і сонечны календары. Параўнальны аналіз сусветных старажытных календароў | 2 | | | | |
| *Тэма 2.* Шляхі фарміравання юліянскай сістэмы летазлічэння як прататыпа сучаснага календара | 2 | | | | |
| *Тэма 3.* Светапоглядныя асновы хрысціянства. Прынцыпы структуравання хрысціянскага календара. Свята Пасхі. Пасхалія. Суаднесенасць веснавых свят беларускага traды-цыйнага календара з пасхальным цыклам | 2 | 2 | | 1 | абарона рэфератаў |
| *Тэма 4.* Дыялог культур: суіснаванне народна-ведыйскага і хрысціянскага календароў у гістарычным кантэксце. Грыгарыянская рэформа календара | 2 | 2 | | 1 | абарона рэфератаў |
| **Раздзел ІІ. Традыцыйныя рытуалы і святы ў сусветных культурах** | | | | | |
| *Тэма 1.* Культы і святкаванні старажытных цывілізацый. | 2 | | | 1 | абарона прэзентацыі |
| *Тэма 2.* Гісторыя асноўных традыцыйных свят усходніх краін (Кітай, Японія) | 2 | | | 1 | абарона прэзентацыі |
| *Тэма 3.* Святочная культура Сярэдневякоўя, эпох Рэнесансу і Рэфармацыі | 2 | | | 1 | абарона прэзентацыі |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Раздзел III. Гісторыя фарміравання беларускай святочнай культуры** | | | | | |
| *Тэма 1.* Касмапланетарныя асновы структуры беларускага народнага календара | 2 | 2 | | 1 | абарона рэфератаў |
| *Тэма 2.* Пантэон вярхоўных багоў як міфалагічная аснова структурнай упарадкаванасці традыцыйнага календара ("каляндарныя" багі) | 2 | 2 | | | |
| *Тэма 3.* Культ продкаў у сістэме каляндарных святкаванняў | 2 | 2 | | 1 | абарона рэфератаў |
| *Тэма 4.* Народная дэманалогія ў сістэме каляндарных святкаванняў | 2 | 2 | | | |
| *Тема 5.* Традыцыі навалеццяў міфарытуальных практыках беларусаў | 2 | | | 1 | абарона рэфератаў |
| *Тема 6.* Ушанаванне першаэлементаў славянскай касмагоніі ў структуры народнага календара: апазіцыі "Неба – Зямля", "вада – агонь" | 2 | | | | |
| *Тэма 7.* Аброчная традыцыя ў сістэме каляндарных абрадаў беларусаў | 2 | | | | |
| *Тэма 8.* Беларускі карнавал: маскі і маскаванне, пераапрананне | 2 | | | 1 | абарона рэфератаў |
| *Тэма 9.* Гульня як абавязковая частка беларускай святочнай культуры | 2 | 2 | | 2 | абарона гульнёвай праграмы |
| **Раздзел IV. Святочная культура: традыцыі і навацыі** | | | | | |
| *Тэма 1.* Дзяржаўныя святы і цырыманіялы. Прафесійныя святы. Гістарычныя і ваенныя святы | 2 | | | 1 | абарона прэзентацыі |
| *Тэма 2.* Міжнародныя і рэспубліканскія фестывалі, рухі, акцыі | 2 | | | 1 | абарона прэзентацыі |
| *Тэма 3.* Мастацка-спартыўныя відовішчы, спартакіяды. Алімпійскія, Паралімпійскія, Дэльфійскія гульні | 2 | | | 1 | абарона прэзентацыі |
| **Усяго...** | **40** | **14** | | **14** | |

## Арганізацыя самастойнай работы

Напісанне творчай работы (рэферата), падрыхтоўка і абарона прэзентацый па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя свят» спрыяюць выкарыстанню атрыманых ведаў у практычнай дзейнасці.

У творчай рабоце неабходна выкарыстоўваць дакладныя веды аб традыцыях святкаванняў у адпаведную культурную эпоху, стварыць мультымедыйную прэзентацыю па выбранай тэме. Абарона творчай работы (або прэзентацыя) павінна ўключаць фота-відэаматэрыялы, тэатралізацыю, акцёрскую манеру выкладання.

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягнастыкі

Кантралюемая мамастойная работа, выконваецца студэнтамі на працягу ўсяго перыяду вывучэння вучэбнай дысцыпліны. Дыягностыка кампетэнцый навучэнцаў праводзіцца з выкарыстаннем:

- абароны рэфератаў;
- абароны прэзентацыі.

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


*Котляров,* М. Г. Народные праздники : практикум [Электронный ресурс]: [16+] / М. Г. Котляров ; Кемеровский государственный институт культуры, Факультет музыкального искусства, Кафедра народного хорового пения. – Кемерово : Кемеровский государственный институт культуры (КемГИК), 2018. – 59 с. – Режим доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=613067.

*Котович,* О. В. Сакральный мир традиции. 99 уроков народной культуры : науч. изд. / О. Котович, Я. Крук. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2018. – 578 с.

*Махлина,* С.Т. Художественная культура Востока. Повседневность и праздники : учеб. пособие для вузов / С. Т. Махлина. – Москва : Юрайт, 2020. – 194, [1] с. : рис. ; 25x16 см. – (Высшее образование).

*Монина,* Н. П. История и теория праздничной культуры [Электронный ресурс]: учеб. пособие : в 6 частях [16+] / Н. П. Монина ; Омский государственный университет им. Ф.М. Достоевского. – Омск : Омский государственный университет им. Ф.М. Достоевского (ОмГУ), 2019. – Часть 6. История праздничной культуры России Нового и Новейшего времени. – 220 с. – Режим доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=575856.


*Дадатковая*


*Агапкина,* Т. А. Мифопоэтические основы славянского народного календаря. Весенне-летний цикл / Т. А. Агапкина. – М. : Индрик, 2002. – 816 с.

*Байбурин, А. К.* Ритуал в традиционной культуре / А. К. Байбурин. – СПб. : Наука, 1993. – 240 с.

Беларусы : у 12 т. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск : Беларус. навука. – Т. 6 : Грамадскія традыцыі / В. Ф. Бацяеў [і інш.]. – 2002. – 606 с.

*Барышаў, Г. І.* Батлейка / Г. І. Барышаў / М-ва культуры Рэсп. Беларусь ; Беларускі ўніверсітэт культуры. – Мінск, 2000. – 270 с.

*Бахтин, М. М.* Творчество Франсуа Рабле и народная культура средневековья и Ренессанса / М. М. Бахтин. – М. : Худож. лит., 1990. – 543 с.

Беларуская міфалогія : энцыкл. слоўнік / рэдкал.: С. Санько (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. І. Клімковіч. – 2-е выд., дап. – Мінск : Беларусь, 2006. – 599 с.

*Брабич, В. М.* Зрелища Древнего мира / В. М. Брабич, Г. С. Плетнева. – Л. : Искусство, 1971. – 78 с.

Беларускі народны каляндар / аўт.-уклад. А. Ю. Лозка. – Мінск : Полымя, 1992. – 205 с.

Гульні, забавы, ігрышчы / рэдкал.: А.С.Фядосік [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 1996. – 534 с.

*Гусев, В.Е.* Народные игры, драмы и театр / В.Е. Гусев // Этнография восточных славян. Очерки традиционной культуры. – М.: Наука, 1987. – 458 с.

*Гуд, П. А.* Ад Каляд да Пакроваў / П. А. Гуд ; рэд.-склад. Л. І. Жук. – Мінск : Красіка-Прынт, 2000. – 223 с. – (Беларусь святочная).

*Гуд, П. А.* Беларускі купальскі комплекс і семантыка абрадавых дзей / П. А. Гуд. – Мінск : Тэхнапрынт, 1999. – 221 с.

*Гуд, П. А.* Беларускі кірмаш / П. А. Гуд, Н. І. Гуд. – Мінск : Полымя, 1996. – 268 с.

*Гуд, П. А.* Мастацтва феерверкаў: вогненна-светлавыя дзеі народаў свету / П. А. Гуд. – Мінск : Мэджик Бук, 2007. – 99 с.

*Гутько, О. В.* История праздников : учеб. пособие / О. В. Гутько. – Челябинск, 2013. – 189 с.

*Даркевич, В. П.* Народная культура средневековья. Светская праздничная жизнь в искусстве IX–XVI вв. / В. П. Даркевич ; отв. ред. Г. К. Вагнер. – М. : Наука, 1988. – 344 с.

Жыццця адвечны лад. Беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад., прадм. і пер. У. Васілевіча. – Мінск : Мастац. літ., 1998. – Кн. 2. – 607 с.

Земляробчы каляндар: абрады і звычаі / Акад. навук БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; [рэд. кал.: В. К. Бандарчык, К. П. Кабашнікаў, А. С. Фядосік (гал. рэд.) ; уклад., класіфікацыя, сіст. матэрыялаў і камент. А. І. Гурскага; уступ. арт. А. І. Гурскага, А. С. Ліса]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 405 с.

Зямля стаіць пасярод свету… / уклад., прадм., пераклад, бібл. У. Васілевіча. – Мінск : Маст. літ., 1996. – 591 с. – (Беларускія народныя прыкметы і павер'і ; кн. 1.)

Зямная дарога ў вырай/ уклад., прадм., пер. У. Васілевіча. – Мінск : Маст. літ., 1999. – 654 с. – (Беларускія народныя прыкметы і павер'і ; кн. 3.)

Ивлева, Л. М. Ряженье в русской традиционной культуре / Л. М. Ивлева. – СПб. : Рос. ин-т истории искусств, 1994. – 235 с.

*Калачова, І. І.* Народныя традыцыі і звычаі выхавання: этнапедагагічная спадчына этнасаў Беларусі / І.І.Калачова. – Мінск: Беларусь, 1999. – 179 с.

Календарный вопрос : сб. ст. / ред.-сост. А. Чхартишвили. – М. : Изд-во Сретен. монастыря, 2000. – 345 с.

Каляндарна-абрадавая паэзія / А. С. Ліс, А. І. Гурскі, В. М. Шарая, У. М. Сівіцкі ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і

фальклору імя К. Крапівы ; навук. рэд.А. С. Фядосік. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 515 с.

*Катовіч, А.* Веснавыя святы : навук.-папуляр. выд. : у 2 кн. / А. Катовіч, Я. Крук.– Мінск : Мастац. літ., 2005. – Кн. 1. – 359 с.

*Катовіч, А.* Веснавыя святы : навук.-папуляр. выд. : у 2 кн. / А. Катовіч, Я. Крук.– Мінск : Мастац. літ., 2005. – Кн. 2. – 413 с.

*Катовіч, А.* Зімовыя святы : навук.-папуляр. выд. / А. Катовіч, Я. Крук. – Мінск : Мастац. літ., 2004. – 119 с.

*Катовіч, А.* Летнія святы : навук. выд. : у 2 кн. / А. Катовіч, Я. Крук.– Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009. – Кн. 1. – 368 с.

*Катовіч,* А. В. Мікольская "Свяча" – феномен абрадавай практыкі беларусаў (в. Чарапы Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці) / Аксана Катовіч, Янка Крук. – Мінск : Інбелкульт, 2013. – 93 с.

*Климишин, И. А.* Календарь и хронология / И. А. Климишин. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Наука, 1985. – 320 с.

*Конович, А. А.* Театрализованные праздники и обряды в СССР / А. А. Конович. – М. : Высш. шк., 1990. – 206 с.

*Котович, О. В.* Белорусская свадьба в пространстве традиционной культуры / О. Котович, Я. Крук. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2012. – 848 с.

*Криничная,* Н. А. Русская мифология: мир образов фольклора /Н. А. Криничная. – М. : Академ. Проект : Гаудеамус, 2004. – 1006 с.

*Крук,* І. І. Следам за сонцам: Бел.нар.каляндар: Дапаможнік для педагогаў дзіцячых дашк. устаноў / І.І. Крук. – Мінск : Ураджай, 1998. – 216 с.

*Крук, Я.* Сімволіка беларускай народнай культуры : навук. выд. / Я. Крук. – Мінск : Беларусь, 2011. – 430 с.

*Кухаронак,* Т.І. Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т. І. Кухаронак. – Мінск: Ураджай, 2001. – 239 с.

*Лозка,* А. Беларуская батлейка. Каляндарныя і абрадавыя гульні / А.Лозка. – Мінск: Тэхналогія, 1997. – 183 с.

Легенды і паданні / [склад.: М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі ; рэдкал.: В. К. Бандарчык і інш.; рэд. тома А. С. Фядосік ; уступ. арт. М. Я. Грынблата]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 544 с.

Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / склад.: І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. : Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2011. – 607 с.

Мифы народов мира : энциклопедия : в 2 т. / гл. ред. С. А. Токарев. – М. : Советская Энциклопедия, 1987. – Т.1 : А-К. – 671 с.

Мифы народов мира : энциклопедия : в 2 т. / гл. ред. С. А. Токарев. – М. : Советская Энциклопедия, 1988. – Т. 2 : К-Я. – 719 с.

Народны тэатр / уклад. М.А. Каладзінскі. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – 554с.

*Ненадавец,* А. М. За смугою міфа / А. М. Ненадавец. – Мінск : Беларус. навука, 1999. – 254 с.

*Ненадавец,* А. М. Міфалогія роднага краю / А. М. Ненадавец. – Мінск : Беларусь, 2018. – 399 с.

*Ненадавец,* А. М. Нарысы беларускай міфалогіі / А. М.Ненадавец. – Мінск: Беларус. навука, 2013. – 535 с.

*Ненадавец,* А. М. Сілаю слова. Чорная і белая магія / А.М. Ненадавец. – Мінск : Беларусь, 2002. – 350 с.

*Новак,* В. С. Міфалогія беларусаў / В. С. Новак. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2005. – 252 с.

*Орлов, О. Л.* Теоретические аспекты изучения праздничной культуры России / О. Л. Орлов. – СПб. : СПбГУКИ, 2001.

*Пави, П.* Словарь театра / П. Пави. – М. : ГИТИС, 2003. – 504 с.

*Рябков, В. М.* Антология форм праздничной и развлекательной культуры России (первая половина XX в.) : учеб. пособие / В. М. Рябков ; Челяб. гос. акад. культуры и искусств. – Челябинск : Полиграф-Мастер, 2007. – Т. 4. – 870 с.

*Сапронов,* П. А. Первобытный ритуал / П. А. Сапронов // Культурология : курс лекций по теории и истории культуры / П. А. Сапронов. – 2-е изд., доп. – СПб. : Лениздат : Союз, 2001. – С.103–114.

*Сержпутоўскі,* А. К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 302 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т. Б. Варфаламеева, В. І. Басько, М. А. Козенка [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2001–2010. – Т. 1 : Магілёўскае Падняпроўе, 2001. – 797 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т. Б. Варфаламеева, А. М. Боганева, М. А. Козенка [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2001 – 2010. – Т. 2 : Віцебскае Падзвінне, 2004. – 910 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / аўт. ідэі Т.Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеева. – Т. 3: Гродзенскае Панямонне. У 2 кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.]. – Мінск : Выш. шк., 2006. – 608 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / аўт. ідэі Т.Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеева. – Т. 3: Гродзенскае Панямонне. У 2 кн. Кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.]. – Мінск : Выш. шк., 2006. – 736 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / аўт. ідэі Т.Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеева. – Т. 4: Брэсцкае Палессе. У 2 кн. Кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.]. – Мінск: Выш. шк., 2009. – 863 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / аўт. ідэі Т.Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеева. – Т. 5: Цэнтральная Беларусь. У 2 кн. Кн. 1 / В. И. Басько [і інш.]. – Мінск: Вышэйш. шк., 2010. – 847 с.

*Шамак,* А. А. Міфалогія Старажытнай Беларусі / А. А. Шамак, – Мінск : Сэр-Віт, 2004. – 240 с.

*Шамякіна,* Т. І. Міфалогія Беларусі: нарысы: вучэб. дапаможнік / Т. І. Шамякіна. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 399 с.

*Шамякіна,* Т. І. Славянская міфалогія : курс лекцый / Т.І. Шамякіна. – Мінск : РІВШ, 2005. – 155 с.

*Шапарова,* Н. С. Краткая энциклопедия славянской мифологии: ок. 1000 ст. / Н. С. Шапарова. – М. : АСТ и др., 2001. – 623 с.

*Шарая, О.Н.* Ценностно-нормативная природа почитания предков / О.Н.Шарая. – Минск:Технология, 2002. – 249 с.

*Шубина, И. Б.* Драматургия и режиссура зрелища: Игра, сопровождающая жизнь : учеб.-метод. пособие / И. Б. Шубина. – Ростов н/Д : Феникс, 2006. – 288 с.

*Черняк, Ю. М.* Режиссура праздников и зрелищ : учеб. пособие для студентов / Ю. М. Черняк. – Минск : ТетраСистемс, 2004. – 223 с.

*Цітоў, А. К.* Гарадская геральдыка Беларусі / А. К. Цітоў. – Мінск : Полымя, 1989. – 207 с.